ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

АЎТОРАК

29 СНЕЖНЯ

1992 года

№ 22

(1687)

МЫ ВЫБАЧАЕМ ГОД МІНУЛЫ

Гэта толькі тваё свята. Нічыё больш. Ты чакаў яго цэлы год. Ты спадзяваўся на вяртанне апошняй навагодняй начы дзяцінства. Тая ноч не вернецца зноў. Але не сумуй. Настальгія па мінулых часах пазбаўляе радасці сённяшняй...

Год, з **якім развітваемся, быў розны. Нікому ён не прынёс адны толькі расчараванні ці, наадварот, толькі шчаслівыя дні. Дык навошта крыўдаваць на яго? Хто ведае — магчыма, некалі давядзецца ўспомніць 1992-гі як самы-самы... і пашкадаваць.**

Дзякуй яму, што за 365 дзён і яшчэ адзін дадатковы, 366-ты, мы засталіся самімі сабой; што побач з намі **паранейшаму родныя і блізкія; што захавалася наша здольнасць заўважаць прыгожае і выратоўвацца з яго дапамогай ад зла; што, нарэшце,** пабагацелі мы яшчэ на адзін год жыцця.

Мы выбачаем год мінулы за страты і непрыемнасці, праблемы і часам безнадзейнасць.

У нас зноў ёсць магчымасць пачаць усё спачатку. Прачнуцца 1 студзеня з новымі надзеямі і ўпэўненасцю, **што яны здзейсняцца. Захапіцца святлом святочнай свечкі і ўбачыць святло ў канцы ўсіх сваіх задум і мар.**

З Новым годам!

Аплата па тарыфу за святочныя

Новы год — свята для ўсіх, нават для тых, хто ў святочную ноч працуе. Наўрад ці гэтыя людзі перш-наперш задумваюцца пра грашовую кампенсацыю за свята, якое іх мінае. Гэта толькі невялікае самазаспакаенне, як і той факт, што выпала працаваць усё ж па графіку.

Ірына Васільеўна БОНДАРАВА працуе вахцёрам у галоўным корпусе БДУ ужо трэці год. І другі раз запар у навагоднюю ноч вартуе:

— Так атрымалася. Але сумаваць не буду. Прыходзьце ў госці — пабачыце. Памятаю, нават у 1942 годзе пад Сталінградам у нас была на свята навагодняя елачка. А святочны настрой можна стварыць ва ўсялякіх умовах.

Нават звычайны дзень можа стаць святам, калі проста сабрацца ўсёй сям'ёй, каб пачаставаць торт «Напалеон», які даручаюць гатаваць толькі Ірыне Васільеўне — любімай бабулі.

Вахцёраў у інтэрнаце ведаюць усе, асабліва імкнуцца пасябраваць з імі напярэдадні святочных ці выхадных.

Яшчэ да навагодніх святкаванняў сярод студэнтаў распаўсюджваецца навіна — на Новы год на вахце...

На гэты раз студэнтам інтэрната № 2 нядрэнна было б пасябраваць з Яўгеніяй Фёдараўнай ПУГАЧ:

— Я ўсё жыццё працавала медработнікам, потым некалькі гадоў з унукамі сядзела — блізнятамі Максімкам і Ірынкай, а таксама Алёшкам і Дзімкам. Шкада — будзе сумнавата мне без іх. Ды і ім без мяне, напэўна.

Усіх нюансаў навагодняй начы ў інтэрнатах, канешне, не ведаю, але ўжо многія калегі падзяліліся сваімі ўражаннямі. Думаю, не адна ж я тут буду — і міліцыя, і хлопцы з аператыўнага атрада.

Нехта казаў: каб год быў шчаслівым, трэба сустракаць яго на новым месцы, з новымі знаёмымі. Калі гэта так, чакайце, Яўгенія Фёдараўна, шчасця неверагоднага.

Сюрпрызы чаканыя і незвычайныя

Ноч вакол навагодняй елкі з агеньчыкамі і свечкамі. Чым весялей для студэнтаў, тым больш хваляванняў для пажарнікаў і міліцыі. Будуць сачыць за парадкам ці за беспарадкам і самі студэнты.

Аператыўны атрад інтэрната № 7 сустракае Новы год 29 снежня, а з 31-га на 1-е студэнт V курса геафака Дзіма Краўцэвіч і 19 хлопцаў з атрада, якімі ён кіруе, будуць напружана працаваць.

Гасцей чакаецца шмат. І ноч, як заўсёды, напоўніцца незвычайнымі і чаканымі сюрпрызамі.

Хлопцы з атрада ўжо тры разы за гэты год прымусілі наведвальнікаў кампенсаваць страты. Адзін з такіх выпадкаў быў нядаўна — каля двух тысяч рублёў прыйшлося заплаціць студэнтам за зламаныя дзверы.

Калі пажадаеце сустрэць Новы год з сябрамі — перашкод ніхто не стварае. Адзіная ўмова — гаспадары пакояў павінны напісаць загадзя заяву, пасля чаго госці атрымаюць запрашэнні, з якімі на вахце ніхто не затрымае. Праўда, калі што-небудзь здарыцца, адказнасць будзе несці разам з госцем і сам гаспадар.

Т. КАЗАК.

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ ГОЛАД НЕ ЗА ГАРАМІ

У дадатак да ўсяго не дужа прыемнага ў студэнцкім жыцці бібліятэка БДУ, як, дарэчы, і яе «сабраты» ў іншых ВНУ, апынулася ў інтэлектуальнай блакадзе.

З наступнага года мы ўсе пазбавімся магчымасці пабачыць на ўласныя вочы платны экземпляр кожнай з кніг, якія выдадзены за межамі Беларусі. Пералічаныя грошы вярнуліся. Пры адсутнасці дзяржаўнай палітыкі ў кнігавыдавецтве і пры тым, што пераважная большасць вучэбнай літаратуры да апошняга часу прыходзіла да нас менавіта з Расіі, студэнцтва і выкладчыцкі састаў пастаўлены перад пагрозай інтэлектуальнага голаду.

Рэзкае пагаршэнне сітуацыі з вучэбнай літаратурай правакуе рэпрэсіі супраць студэнтаў і нават выкладчыкаў. Неабходнасць самых жорсткіх мер прадыктавана рэальнасцю. На сённяшні дзень з 6250 чалавек, якія карыстаюцца вучэбным абанементам бібліятэкі універсітэта, 1457 — запазычанікі.

Цяпер за кожны пратэрмінаваны дзень утрымання падручніка студэнт ці выкладчык павінен будзе выкласці са сваёй кішэні пэўную суму, памеры якой дакладна яшчэ не акрэсліліся. Да таго ж, за страчаную кнігу ўжо зараз трэба плаціць яе намінальны кошт у 10-кратным памеры.

Што датычыць студэнцтва: матэрыяльны бок справы, хутчэй за ўсё, прымусіць задумацца, губляць падручнікі ці не.

Наконт выкладчыкаў — асобная размова. Скажам, у філфакаўскай бібліятэцы кожны другі выкладчык — запазычаннік.

І ўсім ім напярэдадні Новага года раю разлічыцца з бібліятэкай, пакуль Чорны Певень не клюнуў у пустую кішэню.

Юрась ДУБІНА,
студэнт 3 курса факультэта журналістыкі.

О, «ЙЕС»!

«Йес» — не філіял экалагічнага руху ў ЗША. Ад іх дружына геафака ўзяла, як падкрэсліў прэзідэнт Аляксандр Бондараў, толькі назву. Цяпер гэта самастойная арганізацыя з уласным Статутам і праграмай, з поўнай назвай «Моладзь на службе навакольнага асяроддзя».

Дваццаць пяць студэнтаў з розных курсаў і факультэтаў прапагандуюць экалагічныя ідэі, арганізоўваюць экалагічныя таварыствы сярод моладзі, семінары і займаюцца канкрэтнымі справамі.

Дарэчы, іх пакрыўдзілі ў адыходзячым годзе, калі замест маленькіх саджанцаў, якія студэнты пасадзілі ў двары галоўнага корпуса, «вялікія аматары зеляніны» пакінулі толькі старанна разрыхленую зямлю.

Перадсвяточны тыдзень для іх амаль што самы загружаны.

Памятаеце, як у Андэрсена?

«У лесе стаяла цудоўная ялінка. Месца ў яе было добрае, паветра і свяцла ўдосталь, а навокал раслі яе старэйшыя сяброўкі — і елкі, і хвоі. Ялінцы вельмі хацелася хутчэй вырасці...

— Ах, каб я была такой жа дарослай, як іншыя дрэвы! — уздыхала ялінка.— Тады б і я шырока раскінула сваі галінкі, а верхавінай зазірнула б далёка-далёка!

Падыйшлі Каляды, і ялінку ссяклі першую. Сякера глыбока ўрэзалася ў яе цела, і ялінка са стогнам упала на зямлю. Ей стала балюча, яна слабела і ўжо не магла думаць пра сваё будучае шчасце. Сумна ёй было развітвацца з родным лесам, з тым куточкам, дзе яна вырасла,— яна ведала, што ніколі больш не ўбачыць сваіх любых сяброў — кусцікаў, кветак, а магчыма, нават і птушак. Сумотны гэта быў ад'езд...»

Каля 300 гадоў прайшло з таго часу, калі Пётр Першы выдаў загад аб святкаванні Новага года не з 1 верасня, а з 1 студзеня і прапанаваў упрыгожваць пакоі галінкамі (!) хваёвымі, яловымі і ядлаўцовымі. Але дзе там эканоміць, калі нам даспадобы кожны год запрашаць у кватэры гнуткія дрэўцы! Колькі іх ужо знішчана за гэтыя гады — не падлічыць.

А ў выніку... ***«...яны выцягнулі яе з пакоя, пацягнулі па лесвіцы і кінулі ў самы цёмны куток паддашка, куды нават дзённае святло не трапляла...***

Слуга прынёс сякеру і ссек елку на кавалкі — атрымалася цэлая вязанка распалак. Як горача палалі яны пад вялікім катлом! Дрэва глыбока, глыбока ўздыхала, і гэтыя ўздыхі былі падобныя на нягромкія стрэлы... Елка цяжка ўздыхала і ўспамінала ясныя летнія дні і зорныя зімнія ночы ў лесе... І вось нарэшце яна згарэла...»

Акцыя экалагічнай дружыны «Йес» — толькі маленькі кавалачак вялікага выратавання, на якое здольныя і мы з вамі.

Т. КАЗАК.

У МЯХУ — АМАЛЬ ШТО НІЧОГА

Будзе прыгожая таямнічая навагодняя ноч, будуць сняжынкі вадзіць карагоды вакол святочнай елкі... І нікога так не чакаюць дзеці ва ўсім свеце, як шчодрага Дзядулю Мароза. Чым на гэты раз пачастуе?

Няхай для дзяцей застанецца таямніцай, што...

...на падарункі для 2,5 тысяч дашкалят — дзяцей супрацоўнікаў універсітэта выдзелена 365 тысяч рублёў, яшчэ 121 тысяча — на правядзенне навагодніх святкаванняў.

...І ЛАСУНКІ МЯДОВЫЯ

Скажам толькі, што звычайных цукерак у падарунак не будзе. А з трох ласункаў адзін нагадвае знешне сшытак у клетачку, назва другога — зменшаная ад назвы белага хлеба, ну а трэці — самы звычайны, да якога можна дадаць слова мядовы.

КАЛІ ЦУКЕРКІ НЕ ПА ЗУБАХ...

Па словах **Ніны Міхайлаўны ТУРОМШЫ,** намесніка старшыні прафкома студэнтаў, у гэтым годзе вырашылі наогул не набываць ласункаў. Бо немаўлятам цукеркі не па зубах. А вось мяккія цацкі, пэўна, прыйдуцца даспадобы.

P. S. **У АБАРОНУ ЎСЕ РОЎНА ШЧОДРАГА ДЗЕДА МАРОЗА**

Пастарэў дзядуля. Не пад сілу яму цягаць вялікія мяхі з падарункамі (як у нашым з вамі дзяцінстве). Мажліва, падрабнелы яго мех — нейкая адзіная палёгка ў цяжкім дарослым жыцці. Гэтым мы сябе і супакоім...

Т. КАЗАК.

КАЛЯДНЫЯ СУСТРЭЧЫ

Выкладчыкі, пэўна, памятаюць тую «застойную» традыцыю — збірацца на «блакітны агеньчык» тэлевізара, каб сустрэць Новы год у кампаніі вядомых людзей. Насуперак змрочным прадказанням, яна жыве, памяняўшы хіба што назву на «калядныя вечарыны». Павінна ж застацца імгненне паміж развітаннем і сустрэчай, калі аддзячваюць мінуламу, ускладваюць спадзяванні на будучае...

І ўсё ж, адну традыцыю мы парушылі. Не будзе, як вялося , рэктар у навагоднім інтэрв'ю трымаць адказ за ўвесь універсітэт. Пад час сённяшняга «блакітнага агеньчыка» кожны гаворыць за сябе. А планы рэктара? Гэта падарунак года наступнага.

А. І. ЛЕСНІКОВІЧ:

«ПРАГРАМА-МАКСІМУМ — ТЭХНАПАРК»

У гутарцы пра навуковыя дасягненні універсітэта ў 1992 годзе прарэктар Анатоль Іванавіч ЛЕСНІКОВІЧ адзначыў перш за ўсё дзве работы па навукова-тэхнічных рэспубліканскіх праграмах, у выкананні якіх універсітэт ці яго падраздзяленне з'яўляюцца галаўной арганізацыяй.

— Адна — са скарочанай назвай «Лекавыя прэпараты» — выконваецца пад кіраўніцтвам Ф. М. Капуцкага з мэтай стварэння лекаў на аснове вытворных цэлюлозы. Створаны супрацьпухлінныя, супрацьарытмічныя, супрацьзапаленчыя прэпараты пралангіраванага дзеяння.

Другую — звязаную з Чарнобыльскай праблемай — узначальвае У. Р. Барышэўскі. НДІ ядзерных праблем створаны сістэмы для геаэкалагічнага маніторынгу, распрацавана вялікая колькасць прылад для бытавых мэтаў.

У адыходзячым годзе з'явіліся цікавыя работы з удзелам замежных партнёраў. Адна з іх — распрацоўка радыёфакам лазернага абсталявання для высокакамп'ютэрызаванай лабараторыі. Паколькі сувязі з замежнымі навучальнымі ўстановамі непазбежна пашыраюцца, адчуваецца неабходнасць стварэння прававой базы. Каб не было ў нашых вучоных патрэбы «збягаць», а маглі яны працаваць за мяжой на пэўных умовах.

— Якое ж месца займае наш універсітэт у навуковым жыцці рэспублікі?

— Сярод вышэйшых навучальных устаноў гэта сапраўды флагман. Гродзенскі і Гомельскі універсітэты нельга нават параўноўваць. Ды й асноўныя канкурэнты: МРТІ і БПА,— маючы высокі навуковы патэнцыял, усё ж уступаюць нам. Пераканаўчы той факт, што аб'ём фінансавання на навуку ў МРТІ толькі 90, у нас жа, з удзелам трох НДІ,— каля 320 мільёнаў рублёў.

— Гэта дазваляе разлічваць на больш шырокія перспектывы і ў годзе будучым...

— І не толькі. Праграма-максімум — стварэнне сумесна з іншымі ўстановамі і арганізацыямі навукова-тэхнічнага парка па заходняму ўзору.

У лютым гэта прапанова універсітэта, падтрыманая Міністэрствам народнай адукацыі, будзе разглядацца на камісіі па навукова-тэхнічнаму прагрэсу Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі.

Тэхнапарк — дастаткова шырокая структура, у якую, акрамя універсітэцкіх кафедраў, СКТБ (яно, дарэчы, пажыўшы нейкі час самастойна, ізноў пажадала вярнуцца пад крыло універсітэта і стаць яго навуковым падраздзяленнем), малых прадпрыемстваў, маглі б уваходзіць банкі і заводы.

В. Г. ШАДУРСКІ:

«ЧАС СТВАРАЦЬ ІМІДЖ»

Віктар Генадзьевіч ШАДУРСКІ, які ўзначальвае створанае ў верасні універсітэцкае ўпраўленне па міжнародных сувязях, ахарактарызаваў 1992 год як дастаткова ўдалы. Гэта і зразумела — год прынёс вялікія змены ў яго жыццё.

— Гэта пагражала дадатковай нагрузкай ці абяцала пэўныя ільготы?

— Выявіла дадатковую магчымасць для самаўдасканальвання. Я пастаўлены ў такія ўмовы, якія прымушаюць актыўна працаваць. Тым больш, што з самага пачатку, скараціўшы на дзве трэці апарат, мы выконваем былы аб'ём работы.

— ...і плануеце ў наступным годзе...

— ...перш за ўсё, распрацаваць нарматыўныя дакументы. Можна лічыць афіцыйную цырымонію пражыткам і залішняй абузай і заклікаць да яе знішчэння, але я прытрымліваюся меркавання, што прыспеў ужо час стварацъ імідж на міжнародным узроўні.

Зразумела, будзем устаўлёўваць карысныя для універсітэта кантакты з рознымі замежнымі арганізацыямі, зарабляць валюту на патрэбы універсітэта і імкнуцца да таго, каб замест «навуковага турызму» (якім займаюцца некаторыя выкладчыкі паасобку) узнікалі сапраўды трывалыя сувязі. Самымі перспектыўнымі мы лічым кантакты з ФРГ, дзе існуюць дзяржаўныя праграмы падтрымкі міжнародных абменаў, Польшчай, якая ідзе крыху наперадзе Беларусі і можа падзяліцца вопытам, а таксама ўдзельнічаць у праграмах па гуманітарных даследаваннях. Выконваць дамоўленасці з навучальнымі ўстановамі Амерыкі, Кітая і Іспаніі перашкаджаюць часам пэўныя фінансавыя цяжкасці. Наогул, упраўленне зарыентавана не толькі на тое, каб адпраўляць на стажыроўку за мяжу выкладчыкаў, на вучобу — студэнтаў, але і запрашаць да сябе замежных вучоных, тым самым прадастаўляючы магчымасць больш вялікай колькасці людзей мець з імі зносіны.

П. Д. КУХАРЧЫК:

«ПРЫЯРЫТЭТ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ ПРАЦЫ БУДЗЕ АДНОЎЛЕНЫ»

— Як Вам адыходзячы год? — запыталіся мы ў прарэктара Пятра Дзмітрыевіча КУХАРЧЫКА.

— У цэлым я ім задаволены. Былі цяжкасці, але іх мы адолелі.

Асноўная падзея — гэта перадача корпуса былой ВПШ і заўважнае паляпшэнне матэрыяльнай базы гістарычнага, філалагічнага, філасофска-эканамічнага і абодвух матэматычных факультэтаў, а таксама аб'яднанне пад адным дахам фізфака. Дасягненне рэктарата, што ва ўмовах, калі мы яшчэ не пазбавіліся звычкі толькі аднімаць і дзяліць і не навучыліся пакуль складваць і прымнажаць, працэс падзелу новых плошчаў прайшоў без ускладненняў.

У сацыяльнай сферы падзеяй са станоўчым балансам на фоне збяднення грамадства і прыпынення жыллёвага будаўніцтва ў Мінску я назваў бы здачу часткі дома па вуліцы Варанянскага.

1992 год запомніцца складанасцямі ў фінансаванні. Да сакавіка мы распараджаліся сродкамі ўсляпую, а на працягу года перагляд фінансавання ажыццяўляўся тры разы. Ды й колькасць папер: купоны, разліковыя білеты — узрасла. Праўда, наракаць на работу бухгалтэрыі і планава-фінансавага аддзела не даводзіцца — толькі адзін раз мы не выплацілі ў час аванс.

Нягледзячы на агульны хаос у рэспубліцы, універсітэт мэтанакіравана паляпшае матэрыяльна-тэхнічную базу: будуецца біястанцыя на возеры Нарач, біялагічны корпус і інтэрнат у Шчамысліцы, рэканструіруецца стары фізічны корпус.

— Як лічыце, паляпшэнні ці пагаршэнні жыцця чакаць вышэйшай школе рэспублікі?

— Год назад у мяне пыталіся пра гэта студэнты. Я адказаў: нават тое, што прэстыж вышэйшай адукацыі пахіснуўся, не дае падставы меркаваць, што праз пяць гадоў адукаваны інжынер будзе атрымліваць менш за простага рабочага. Інтэлектуальная праца будзе аплочвацца вышэй за фізічную. Хоць пакуль у сувязі з навагоднім павышэннем цэнаў нас чакаюць новыя цяжкасці. І ўсё ж прыярытэт інтэлектуальнай працы будзе адноўлены.

— На працягу вызначанай пяцігодкі кардынальнага змяшчэння прыярытэтаў ці не пужае вас узрастаючая пагроза «ўцечкі мазгоў»?

— Так. Тэндэнцыя ёсць. Беларусь — невялікая дзяржава з высокім навуковым патэнцыялам. Але калі нават толькі частка спецыялістаў, якія папрацавалі за мяжой, вернецца і будзе ўзбагачаць ведамі беларускіх жа студэнтаў, патэнцыял нацыі ад гэтага яшчэ больш узрасце. Не трэба пазбягаць перспектыў навуковага абмену з замежжам.

— Ці плануецца скарациць прыём на наступны навучальны год?

— Пакуль не. Ён застаецца на ранейшым узроўні. Затое на філасофска-эканамічным факультэце адкрыецца новая спецыяльнасць — сацыяльная псіхалогія. Час патрабуе аддаваць перавагу гуманітарнаму цыклу, які больш за ўсё пакутваў раней на заідэалагізаванасць.

— Якога падарунка чакаеце асабіста для сябе?

— Каб праца навукова-выкладчыцкага саставу (такім чынам, і мая) ацэньвалася сапраўднай вартасцю.

ПАГАДНЕННЕ ГОДА

Давайце працаваць разам!

У СЯРЭДЗІНЕ СНЕЖНЯ БДУ НАВЕДАЛА ДЭЛЕГАЦЫЯ ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА Г. КЕЛЬЦЭ (ПОЛЬШЧА) У СКЛАДЗЕ РЭКТАРА ПРАФЕСАРА АДАМА КАЛАНТАЯ, ПРАРЭКТАРА ПРАФЕСАРА АДАМА МАСАЛЬСКАГА І АД'ЮНКТА ДОКТАРА ЛЕХА ЗАКРЭЎСКАГА.

Нехта зазначыць, што сувязі з суседняй Польшчай, а не з заакеанскай Амерыкай ўсё роўна, што сініца ў руках, калі жораў па-ранейшаму ў небе. І памыліцца. Бо Амерыка — краіна настолькі ж далёкая, наколькі і нязведаная. З традыцыямі і звычаямі ў многім непрымальнымі для нас. А Польшча — той жа славянскі тып менталітэту, тое ж раздарожжа паміж сацыялізмам і капіталізмам, той жа эканамічны крызіс, што і ў нас.

Вось чаму пад час сустрэчы ў рэктараце Фёдар Мікалаевіч КАПУЦКІ падкрэсліў, што арыентавацца мы будзем на бліжэйшых суседзяў. У выніку візіту было заключана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і педагагічным універсітэтам (г. Кельцэ). І хоць рабочая праграма пакуль не падпісана, але існуе ўжо дамоўленасць аб абмене вопытам работы, публікацыямі, навукова-метадычнымі і навуковымі матэрыяламі, абмене студэнтамі (не толькі вучэбным, але і культурным), запрашэнні на працу выкладчыкаў (у першую чаргу філолагаў) тэрмінам да аднаго года. І самае галоўнае, што універсітэт г. Кельцэ будзе прадстаўляць інтарэсы нашага на тэрыторыі Польшчы, а БДУ — Кельцкага на тэрыторыі Беларусі.

Візіт завершаны. Ёсць спадзяванні, што гэта толькі першы крок на доўгім шляху сумеснай працы.

На здымку: пад час сустрэчы ў рэктараце.
Фота Г. КРАСОЎСКАГА.

В. М. ЦЯСЛЕНКА:

«НАВЕДВАЛЬНІКІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАДАВОЛЕНЫ»

Начальнік аддзела кадраў знаёмы амаль усім супрацоўнікам універсітэта. Такі ўжо выпаў яму лёс, каб увесь дзень не зачыняліся дзверы ад вялікай колькасці наведвальнікаў, якім ён умела «навязвае» свае ўмовы зносін.

— Такія правілы гульні: кожнаму — вычарпальную кансультацыю ці неадкладнае вырашэнне яго праблем — цалкам задавальняюць тых, хто звяртаецца да нас. Ва ўсялякім выпадку, скаргаў на няўважлівыя адносіны ці грубасць супрацоўнікаў аддзела кадраў няма. Мы проста кардынальна змянілі стыль работы аддзела.

Да другога буйнога поспеху я б аднёс укараненне АСК «Кадры». Сямімільныя скачкі інфляцыі прымушалі зарплату ўсіх без выключэння супрацоўнікаў мяняцца праз кожныя два-тры месяцы. Без выкарыстання ЭВМ гэта работа выконвалася з вялікай колькасцю памылак, што выклікала справядлівыя нараканні «пакутнікаў» ад перагляду зарплаты. Цяпер прагнозы аб назначэнні чарговых службовых акладаў рыхтуюцца з дапамогай ЭВМ. Памылак практычна няма. Ды й час на вырашэнне надзённых пытанняў заўважна скараціўся.

На чарзе стварэнне адзінай базы дадзеных для аддзела кадраў і бухгалтэрыі. Такія ж прывабныя перспектывы чакаюць і планава-фінансавы аддзел.

А. В. ПАЎЛАЎ:

«Я СПАКОЙНА МАГУ ГЛЯДЗЕЦЬ ЛЮДЗЯМ У ВОЧЫ»

Ваяўніча, як ніколі, былі настроены ў адыходзячым годзе работнікі вышэйшай школы, змагаючыся за сацыяльныя правы. Вузенькая сцяжынка вайны перакрыла, нарэшце, рух самага шырокага праспекта сталіцы. Шмат хваляваліся. Чаго дасягнулі?

Падлічвае старшыня прафкома супрацоўнікаў універсітэта **Анатоль Васільевіч ПАЎЛАЎ:**

— Як мне здаецца, дык і не вельмі аб лёсе сваім клапаціліся. Калі шчыра, самае галоўнае сацыяльнае пытанне вырашылі за нас настаўнікі. Сярод шасцітысячнага рашуча настроенага натоўпу на плошчы было не больш за сотню супрацоўнікаў універсітэта. Зразумела, мы не атрымалі ўсяго, на што спадзяваліся, але, калі параўнаць з Расіяй, то нашы сціплыя зарплаты ўдвая вышэй. Дзякуй, БРК і Савет старшыняў вышэйшых навучальных устаноў!

Што датычыць астатніх сацыяльных праграм. У абстаноўцы нестабільнасці, нявызначанасці арыентыраў наш прафком змог дапамагчы аздаравіцца і адпачыць пяцістам супрацоўнікам. Рызыкуючы перарасходваць сродкі, мы аплочвалі не толькі плановыя, але і набытыя за межамі універсітэта пуцёўкі ў санаторыі, дамы адпачынку, на турыстычныя базы.

На нас наракаюць, часам маючы рацыю, але, калі нешта здараецца, у нас жа і шукаюць паратунку. Таму я спакойна магу глядзець у вочы людзям, чые правы абараняў і на канферэнцыях, і пад час сустрэч з прадстаўнікамі ўрада, і ў сродках масавай інфармацыі, і на сваім працоўным месцы.

І ўсё ж, Новы год сустракаю з цяжкім пачуццём, бо размяркоўваць дабытыя з вялікай цяжкасцю кватэры ў новым доме, аказваецца, яшчэ цяжэй. У сітуацыі, калі з 40 жадаючых патрэбна выбраць 14 навасёлаў, у кожнай камбінацыі застаецца 26 незадаволеных.

— Чаго нам чакаць ад наступнага года?

— Я не аматар прагнозаў. (Хто ў студзені мог прадказаць дзень сённяшні?). Але ж спадзяюся, што першыя прыкметы, аб якіх сведчыць статыстыка, прадказваюць нейкую стабілізацыю.

— Але ж на прафсаюз мы можам спадзявацца?

— Так. І калі спадзяванні не спраўдзяцца (хоць зробім мы ўсё, што ад нас залежыць), можаце правесці перавыбары.

ЗАПРАШАЛЬНЫ БІЛЕТ

ПРЭМ'ЕРА ЦУДАЎ

Хочацца запрасіць сюды самых іранічных скептыкаў, якія наогул не вераць у цуды.

Не, на гэты раз у тэатры музычнай камедыі не аперэта і не бенефіс, а самы сапраўдны ЦУД, які ЗДАРАЕЦЦА толькі напярэдадні Новага года: 27 снежня тут дэбютавалі два балетныя спектаклі — «Штраусіяна» і «Іспанскі дывертысмент».Са студзеня яны зоймуць сваё месца ў рэпертуарнай афішы — так навагодні ЦУД ПЕРАЎВАСАБЛЯЕЦЦА Ў РЭАЛЬНАСЦЬ.

Калі ласка, не шукайце ў праграмцы кароткі змест гэтых спектакляў. Яго там няма, бо ўсё зразумела без слоў. Кожная мініяцюра населена мноствам яскравых вобразаў, якія лёгка прачытваюцца, але пакідаюць магчымасць для індывідуальнага ўспрымання.

«Штраусіяна» — сапраўдная феерыя з родных для слыху тэм вялікага кампазітара, увасобленых у харэаграфіі знакамітага Бурмейстэра. Уладзімір Паўлавіч заўсёды імкнуўся да таго, каб яго пастаноўкі не патрабавалі тлумачэнняў на словах. «Штраусіяна», такая багатая на запамінальныя акцёрскія партыі і сталую драматургію, сёння не ідзе ні ў адным тэатры былога Савецкага Саюза. Толькі ў нас. ЦУД ВЫКЛЮЧНЫ па сваёй прыродзе.

Чалавечыя жэсты, рухі, міміку, пластыку немагчыма выкласці ў словах на паперы. Кожны спектакль непаўторны, нават калі іграецца сотні разоў. У. П. Бурмейстэр памёр у 1971 годзе. А на нашай сцэне — дзейства, створанае ім. Вялікую харэаграфію артысты розных пакаленняў перадаюць адзін аднаму з ног у ногі — быццам з вуснаў у вусны. І ЦУД ВЯРТАЕЦЦА! Дапамагла перанесці на сцэну нашага тэатра «Штарусіяну» Наталля Мікалаеўна Васкрасенская, рэпетытар балетнай трупы Крамлёўскага Палаца з'ездаў. Раней яна танцавала ў Музычным тэатры імя Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі — тэатры, дзе працаваў Бурмейстэр.

Ён жа паставіў адну з мініяцюр «Іспанскага дывертысмента» — другога падарунка прэм'ернага вечара. Іншыя жамчужыны гэтага балета перанесены са спектакля «Іспанскія мініяцюры», які з фенаменальным поспехам ішоў некалі ў былым Кіраўскім тэатры оперы і балета былога Ленінграда. Гэта пастаноўка лічылася настолькі бліскучай, што яе не адразу асмеліліся пераносіць на свае сцэны іншыя тэатры. Потым усё ж паспрабавалі, у тым ліку ў Пермскім оперным. Вядучай танцоўшчыцай яго балетнай трупы была тады Ніна Дзячэнка. Менавіта на яе і перанеслі «Іспанскія мініяцюры». Сёння Ніна Мікалаеўна працуе над часткай тых жа мініяцюр у нашым тэатры музычнай камедыі. Толькі цяпер ужо ў якасці балетмайстара.

Яна прыйшла на работу ў тэатр паўгода таму па запрашэнню дырэктара Сяргея Рыгоравіча Косціна. Яе з'яўленне тут — без перабольшання місія. Ніна Мікалаеўна, атрымаўшы гарачую падтрымку кіраўніка тэатра, узялася ўзняць прафесійны ўзровень балетнай трупы. Але гэта не пагражае звальненнем тым, хто танцуе тут даўно. Яны на роўных з сёлетнімі выпускнікамі харэаграфічнага вучылішча, якія прыйшлі ў тэатр разам з Нінай Мікалаеўнай. Яна называе іх акцёрамі і індывідуальнасцямі і верыць у высокі творчы патэнцыял калектыву. Таго самага, якому ў аперэце заўсёды адводзіцца другасная роля аздаблення, фону, дапаўнення. Цяпер удзельнікі трупы ўпершыню атрымалі сапраўдную работу, магчымасць раскрыцца і вырасці. Ніна Мікалаеўна ўпэўнена, што гэта ўжо здарылася. ЦУД заўсёды МАЕ ПАТРЭБУ Ў ВЕРЫ.

Напярадзе — новыя балетныя пастаноўкі, якіх дастаткова ў планах балетмайстара Дзячэнка. Пакуль яны трымаюцца ў сакрэце ад гледачоў, але ўхваляюцца ў тэатры.

Так напярэдадні Новага года нарадзілася ў Мінску яшчэ адна балетная трупа. Дакладней, адрадзілася. У рэпертуары тэатра музычнай камедыі ўжо быў чыста балетны спектакль — «Паненка і хуліган» (на музыку Дзмітрыя Шастаковіча). Гаворыць, ішоў з поспехам. Такім чынам — ЦУД НЕ БЫВАЕ ВЫПАДКОВЫМ. І як жа ў гэта не верыць?

Вераніка БЯГУН.

ЧАЛАВЕК XX СТАГОДДЗЯ

А. І. ЗЕЛЯНКОЎ:

«КАРДЫНАЛЬНЫХ ЗМЕН У СВАІМ ЖЫЦЦІ НЕ ПРАДБАЧУ»

Прызнанне ніколі не прыходзіць само па сабе. Заўсёды вандруе на пару з напружанай працай. Шкада толькі, што часцей мае яно зусім не мясцовую прапіску, таму што ў сваёй Айчыне няма прарока, які б усвядоміў сам і засяродзіў увагу іншых на злачыннасці эканамічнай палітыкі, пры якой выкладчык ВНУ займае перадапошняе месца ў табліцы градацыі заробкаў (на апошнім, да вашага ведама, прыбіральшчыцы).

Так ці інакш, а за мяжой нашых вучоных бяруць «на заметку», іх працы старанна вывучаюць, збіраюць біяграфічныя звесткі, меркаванні сусветных свяцілаў і часам уручаюць узнагароды. Выконвае гэтую высакародную місію Кембрыджскі Міжнародны біяграфічны цэнтр.

Адным з нямногіх людзей свету унікальную ўзнагароду XX стагоддзя «За дасягненне» атрымаў прарэктар, загадчык кафедры філасофіі і метадалогіі навукі Анатоль Ізотавіч ЗЕЛЯНКОЎ.

Анатоль Ізотавіч, якім чынам Вас заўважылі?

— Кембрыджскі Біяграфічны цэнтр — прэстыжная міжнародная арганізацыя, якая займаецца выданнем розных інфармацыйных слоўнікаў, даведнікаў, дапаможнікаў, якія, дарэчы, дасылаюцца ў больш за сотню краін свету. Скажам, слоўнік творчых людзей, ці «Хто ёсць хто ў навуцы, мастацтве, палітыцы». Гэтай работай займаюцца спецыяльныя рэдакцыйныя саветы па вывучэнню кірункаў ведаў. Зацікавіўшыся якой-небудзь асобай, яны заводзяць перапіску. Так было і са мной. Адказаўшы на 100 пытанняў анкеты цэнтра, даслаў яе разам са сваімі публікацыямі і праз некаторы час атрымаў прапанову быць апублікаваным у адным з выданняў. Потым, пэўна, мае дадзеныя апынуліся ў савеце «Міжнародны чалавек года». Я ў той час быў вельмі заняты, даслаў толькі ветлівы адказ. Хто ведае, магчыма, ім спадабалася мая вытрымка, бо некалькі месяцаў назад я атрымаў ліст ад дырэктара цэнтра Эрнста Кэя з паведамленнем аб тым, што я «адзін з нямногіх людзей у свеце ўдастоены ўзнагароды XX стагоддзя «За дасягненне», якая не можа ўжо паўтарыцца на працягу ста гадоў». Узнагароджаныя за пэўную суму атрымліваюць дыплом і срэбны ці бронзавы медаль. Паколькі валюты проста не хапае, мяне асабіста задавальняе проста дыплом.

— Вы шмат разоў бывалі ў Германіі (і зараз з доктарам Ханоем з Йенскага універсітэта выконваеце сумесны праект, які датычыць метадалогіі сучаснай навукі), чыталі аспірантам лекцыі ў Пекінскім палітыка - юрыдычным універсітэце, як фулбрайтаўскі стыпендыят некалькі гадоў таму выступалі з лекцыямі ў 17 універсітэтах ЗША. Ці ёсць сярод Вашых знаёмых у свеце вучоныя XX стагоддзя?

— Не ведаю. У адной з дасланых мне брашур, праўда, паведамляецца, што ўсе, хто атрымаў гэтую ўзнагароду, будуць запрошаны ў Кембрыдж у 1999 годзе для сустрэчы людзей стагоддзя. Вось там і пазнаёмімся.

— Шэраг падзей затрымаў развіццё філасофскай думкі на абшарах былога Савецкага Саюза. Мы доўгі час не бачылі свет і не паказвалі сябе. Такім чынам, ці маю я рацыю, запрашаючы Вас параўнаць узровень былых савецкіх спецыялістаў у гэтай галіне навукі і замежных?

— Наогул паняцце філасофіі, так, як яно ўспрымаецца масавай свядомасцю, вельмі трансфарміраванае. Часта філасофія ўспрымаецца як ідэалогія, нават палітыка. На самой справе, гэта сур'ёзная прафесійная дзейнасць далёка стаіць ад розных палітычных асацыяцый. На нашай кафедры многае было зроблена для таго, каб заклясці навуковую школу ў галіне філасофіі пазнання, навукі, метадалогіі. І мая доктарская дысертацыя якраз закранала галіну метадалогіі навукі.

Апошнім часам, праўда, гаварыць аб метадалогіі навукі наогул наўрад ці прымальна. Таму, улічваючы постчарнобыльскую сітуацыю і тое, што экалогія цяпер інтэнсіўна ўваходзіць у лік самых прыярытэтных і фундаментальна важных галін ведаў, наша кафедра займаецца праблемамі сацыяльнай экалогіі.

Я ўяўляю сабе, што філасофія ў сённяшняй сітуацыі можа развівацца па двух кірунках. Першы — абстрактна-асветніцкая парадыгма, якая прадугледжвае далучэнне да скарбніц сусветнай філасофскай культуры, да яе традыцый (што асабліва важна ў эпоху глабальнага крызісу, у якім апынулася наша грамадства). Але я глыбока перакананы ў тым, што абмяжоўваць філасофію толькі гэтым недапушчальна. Таму што філасофія здольная асіміляваць увесь духоўнасацыяльны вопыт на асаблівай мове. Гэта форма культуры, якая з'яўляецца своеасаблівым сінтэзам усёй культуры, навукі, рэлігіі, маралі, структуры штодзённай свядомасці. У тым унікальнасць філасофіі, што здольная яна даць уяўленне аб стратэгічным сацыяльным прагнозе. Такім чынам, гэтая навука павінна выступаць своеасаблівай метадалогіяй, у межах якой вырашаюцца пытанні развіцця асобы, палітычныя, экалагічныя. Ніколькі не сумняваючыся ў неабходнасці першай парадыгмы, я лічу яе важнейшай перадумовай для стваральнай работы. У нас ёсць ужо і акрэсленыя вынікі.

Мае калегі на Захадзе больш гнутка разглядаюць сітуацыю развіцця філасофіі ў нашай краіне, чым мы самі. Гэта складанае пытанне, якое не вырашыць, навесіўшы ярлыкі «марксіст — не марксіст». У нас на кафедры ніхто ніколі не дэкларавуе свае палітычныя сімпатыі. Як, дарэчы, і ў тым амерыканскім універсітэце, дзе мне давялося пабываць. Звычайная кафедра — 9 чалавек, сярод якіх два буйных спецыяліста з сусветным імем. Яны з цікавасцю ставіліся да мяне.

У галіне філасофіі, як і кожнай навукі, перш за ўсё, ацэньваюцца веды, прафесіяналізм, творчыя ідэі, здольнасць іх абгрунтаваць.

Я не адчуваў комплекса непаўнацэннасці. Хоць, зразумела, у нашым філасофскім згуртаванні шмат прафесіяналаў, зарыентаваных на палітычную кан'юнктуру. Мы апынуліся ўбаку ад магістральнай лініі развіцця сусветнай філасофіі. Рэпрэсіўная дамінанта адной праграмы — марксісцкай — нанесла вялікі ўрон навуцы. Таму цяпер нашай кафедрай распрацоўваецца новая праграма. Мы імкнемся стварыць у студэнта ўяўленне аб розных школах, кірунках, сістэмах думкі, каб пагрузіць яго ў гэты неабсяжны свет.

— Вас не пужае, што ён разгубіцца і пойдзе на дно? Нашмат прасцей вывучыць выкладзеную дактрыну, чым блукаць у лабірынтах выбару.

— Вы закранулі надзвычай важную і не менш складаную праблему. Наша грамадства апынулася твар да твару з новай сацыяльнай рэальнасцю, так званай рынкавай эканомікай. Патрэбна адмаўляцца ад усяго, да чаго прызвычаіліся.

Студэнт, сапраўды, можа разгубіцца. Але ж у ім павінна прачнуцца патрэбнасць выбару, без якой няма свабоды, а значыць, асобы і дэмакратыі.

— Анатоль Ізотавіч, якіх яшчэ змен чакаць студэнтам у сувязі з тым, што лекцыі ім цяпер будзе чытаць чалавек XX стагоддзя?

— Я не думаю, што гэта кардынальна паўздзейнічае на маю работу і іншыя абавязкі.

— Ці звязаны «іншыя абавязкі» нейкім чынам з філасофіяй?

— Цікавае пытанне. Вельмі складанае, да таго ж. Я пакуль не гатовы да адказу.

Калі ж атрымаецца на новай пасадзе хоць што-небудзь зрабіць, каб нейкім чынам станоўча паўплываць на цяжкае становішча сацыяльна-гуманітарных навук, я буду рады.

Гутарку вяла
Марына ЗАГОРСКАЯ.

«И ВОЙСКО ПЕСЕН ПОВЕДУ»

Кожная песня Алены Камбуравай — міні-спектакль. Вось яна нерухома стаіць, па-школьнаму апусціўшы рукі, а праз імгненне сарвалася з месца, закруцілася ў ірэальным танцы, яна — і Дон-Кіхот, і Іосіф, і Іван Грозны. Новая песня — іншы голас. Ён раздзірае, прымушае здрыгануцца, з адчаем б'ецца ў вушах і ўзлятае да неймавернай вышыні, потым зрываецца да спалоханага шэпту дзіцяці. Спявачка, якая іграе, актрыса, якая спявае. Маленькая жанчына ў ломкіх снапах святла, яна ўзмахам грацыёзнай рукі раскідвае палітры сусвету. І — фатальная асуджанасць яе гераіні.

Зала ўзрываецца апладысментамі. Алена Камбурава разгубленa прыціскае букет кветак у акружэнні яркіх арлекінаў з радыё, якія цягнуць яе ў прамы эфір. Потым — надакучлівыя паклоннікі і — некалькі пытанняў інтэрв'ю.

— Алена Антонаўна, у кожнага часу — свае песні. У сённяшнім канцэрце прагучалі песні на вершы Блока, Ахматавай, Гарсіа Лоркі... Чым абумоўлены зварот да класікі?

— Сапраўды, з'яўляюцца на свет новыя людзі, якія па-свойму адчуваюць. А песні пра тое, што адбываецца ў іх за вокнамі. Больш цудоўна адчуваць сябе ў тысячагоддзі, чым у дваццацігоддзі ці нават у стагоддзі. Тое, што нешта напісана стагоддзе таму, не так важна. Галоўнае — як. Калі мяне гэта захапіла, я не думаю, ці даўно яно створана, кажу толькі, хто і калі напісаў, бо трэба напомніць. Дасканалая архітэктура мяне натхняе. Тое ж і з паэзіяй.

— Хто Ваш любімы паэт?

— У мяне іх вельмі многа. Зусім асобна, безумоўна, стаіць Цвятаева...

— Акуджава на адной з сустрэч з тэлегледачамі ў Астанкіна параўнаў сябе з рамізнікам, які праехаў па Цвярской і цяпер вяртаецца. Як Вы адчуваеце сябе ў часе?

— Я не згодна з Акуджавай. Калі нашаму грамадству пашчасціць, калі людзі змогуць стварыць зусім іншую супольнасць, тады яго песні будуць апраўданнем нашага пакалення. Нейкая частка іх адамрэ, але ж паэзія не можа стаць архаічнай. Вось мы вывучаем гісторыю паэзіі і гаворым: былі футурысты. І быў — Пушкін, прама са свайго стагоддзя крочыў у наша. Намаляваць і потым назваць гэта можна парознаму. Малююць белую кропку на чорным фоне. Але сапраўднае — гэта дрэвы, якія як раслі, вытанчана-прыгожыя, так і растуць, таксама па-ранейшаму цудоўная трава. Мастацтва можа мяняць напрамак, але гэта — толькі тэхніка. Зараз мы ведаем тое, чаго не ведалі раней нашы продкі, але мы пазбаўлены іх немітуслівага жыцця. Яны не гаварылі — мы ствараем, яны падкрэслівалі — Бог стварае.

— З чым Вы прачынаецеся раніцай?

— З надзеяй. Не, часам — адчай, моцны адчай, і я адчуваю сябе маленькім партызанскім атрадзікам у вайне, дзе выйграюць варвары.

— Як у Хлебнікава:

Сегодня снова в бой пойду,
Туда на жизнь, на бой, на рынок,
И войско песен поведу
С прибоем рынков в поединок.

— Я таксама вельмі Хлебнікава люблю. Часта ім канцэрты адкрываю.

Потым яна ўзяла паперу і напісала: «Добрых і светлых вачэй вам. Алена Камбурава».

Вольга МАМЧЫЦ,
Ціна КЛЫКОЎСКАЯ,
студэнткі факультэта журналістыкі.

ПАЧАЛОСЯ!

ЧАКАННЕ СВЯТА

Лепшае свята — гэта яго чаканне. За пяць дзён да развітання са старым годам шкада яго яшчэ не так, як пасля апоўначы 1 студзеня. Ёсць час успомніць лепшае, што прынёс год адыходзячы, і памарыць пра падарункі года будучага. Яшчэ няма святочнай мітусні і не пакідае прыемнае ўсведамленне, што цудоўная навагодняя ноч — пакуль наперадзе.

Значыць, лепшы тэрмін да пачатку — 26 снежня, калі ў Інфармацыйна - культурным цэнтры Саўміна адгрымеў універсітэцкі навагодні баль.

Дастаткова было выкласці пэўную суму за ўваходны білет, каб забяспечыць сябе на ўвесь вечар забавамі. Тым больш, што сума гэта — амаль прывідная. Да 20 снежня білет каштаваў 90 рублёў, пазней — 130, а ў дзень балю — 160 рублёў. Такіх грошай ледзь хопіць нават на самыя сціплыя ўцехі. А тыя, хто дадаў да іх гатоўнасць весяліцца, добразычлівасць і шчырую веру ў цуды, пачалі сустракаць навагодняе свята за пяць дзён да яго.

НАВАГОДНІ ПАДАРУНАК

Вам прапануецца прыняць удзел у конкурсе. Калі вы зразумееце, у якім і навошта,— свае першыя балы як удзельнік спаборніцтва вы ўжо зарабілі.

Дадзены сюрпрыз для жадаючых атрымаць яго падрыхтавала фірма «Юнілевэ». Поспехаў!

A CHALLENGE IN EUROPEAN MANAGEMENT TEAMWORK

EXPLORE YOUR POTENTIAL WITH CHAMP 93

Do you want to participate in the largest and most ambitious management competition ever? Students from all academic backgrounds and all corners of the new Europe will be taking part, from Russia in the East to Portugal in the West, and from the Mediterranean to the Arctic Circle.

Teams of four undergraduate students will compete in real-life management exercises in one of seven European forums. Successful teams will be flown to London to compete in the finals. The winning team will receive a cash prize of ECUs 2000 and enjoy an eight-week sponsored placement with Unilever, one of the world's most successful consumer goods companies.

If you think you have management potential and enjoy working in a team, send off the form below for an application pack, or contact CHAMP 93 direct on:
telephone +(44) 71 262 5050, or fax +(44) 71 724 7875.

Champ 93 is managed by students of London Business School in conjunction with Association des Etats Generaux des Etudiants de l'Europe.

Sponsored by Unilever

CHAMP 93

Please send me an application pack
Name
Address

I am a student at University

Send to: CHAMP 93, London Business School, Sussex Place, Regent's Park, London NW1 4SA, UK
Requests for application packs must be received by 31st January 1993.

ХОЧАЦЕ — ПРАВЕРЦЕ

ВАРАЖБІЛІ АДНОЙЧЫ ДЗЯЎЧАТЫ...

Ой, Калядачкі... Пачнуцца 6 студзеня і будуць працягвацца два тыдні. І зноў прыйдуць святочныя вечары, галоўны сэнс якіх для маладых дзяўчат спрадвеку быў у варажбе.

Варажба належыць да язычніцкіх абрадаў, калі ў час служэння багіні Гадзе (багіні фартуны, шчасця) нашы продкі па асаблівых знаках імкнуліся даведацца, што чакае іх у будучым.

Варажыць можна ў любы дзень Калядаў. Але найбольш важнай і значнай лічылася варажба напярэдадні Каляд, Новага года і асабліва Хрышчэння.

Лёс выпрабоўвалі па-рознаму. Сёння гэта таксама цікавы і прыцягальны занятак для многіх. Разам са старадаўнімі спосабамі варажбіткі выкарыстоўваюць і новыя, многія з якіх прывезены з іншых краёў. Прапануем вам адзін з іх — варажбу на ценях. Спадзяёмся, гэта прынясе вам хвіліны радасці. Але вы можаце аддаць перавагу і іншым спосабам варажбы: напрыклад, на бобе, з пеўнем або на кафейнай гушчы.

Цені заўсёды прывабліваюць людзей сваёй патаемнасцю. Яны такія ж таямнічыя, як і сам лёс — таму з іх дапамогай і спрабуюць яго прадказаць.

Вам спатрэбяцца свечка, аркуш газетнай паперы, падстаўка, якая не гарыць, для гэтага можна выкарыстасць донца перавернутай талеркі.

Пачынаем. Лепш варажыць уначы і калі на небе поўня. Скамячыце паперу, пакладзіце на падстаўку, запаліце свечку. Святло ад свечкі павінна падаць так, каб на сцяне ўтваралася выразная цень ад паперы. Уважліва разглядзіце малюнак на сцяне, запішыце.

Затым падпаліце паперу з трох бакоў адной запалкай. Будзьце вельмі ўважлівыя. Калі полымя разгарыцца, цяжка сачыць за ценямі, якія мяняюцца імгненна, і запамінаць паслядоўнасць іх з'яўлення. Асабліва складана разабрацца ў групавых ценях, якія ўтвараюць цэлыя карціны. Тут важна правільна ацаніць дзеянне і вызначыць яго значэнне. Не забывайце запісваць. Гэта дапаможа вам у правільнай расшыфроўцы сімвалаў.

А цяпер уважліва прачытайце свае запісы. Магчыма, іх лепш перапісаць і спакойна перайсці да расшыфроўкі варажбы.

Як гэта зрабіць? Вам дапаможа наступны прыклад.

Калі першая цень, якую вы ўбачылі на сцяне, мае форму чалавека, які сядзіць у напружанай позе, гэта значыць, што ў дадзены момант вы спрабуеце вырашыць задачу, якая вам не па сілах (чалавек, які сядзіць — сімвал бездапаможнасці).

Вы падпалілі газету і бачыце, што чалавек на сцяне прыўстаў,— значыць, вы знайшлі нейкае рашэнне. Потым малюнак змяніўся і набыў форму дома — вы знойдзеце рашэнне пад родным дахам, без чужой дапамогі. У напрамку да вашага дома рухаецца конь — чакайце плёткі, якую прынясе вядомы вам чалавек. Вакол дома — мітусня. Цені хутка мяняюцца: кот, ліса, з'яўляюцца і знікаюць нейкія людзі. Сэнс тлумачэння такі: вам цяжка, і вакол вас, на жаль, зусім не тыя, хто здолеў бы дапамагчы ў гэты складаны час. А вось абрысы дома расплыліся, застаўся ўзгорачак, на якім сядзіць пацук,— калі мітусня вакол вас скончыцца, вы будзеце дарэмна траціць грошы, рабіць даўгі.

Малюнак на сцяне дакладна аформіўся, калі папера дагарэла, і больш не мяняецца. Вы бачыце абрысы сабакі. Гэта значыць, вам дапаможа сябар, і адносіны з навакольным светам зменяцца ў лепшы бок.

А цяпер пазнаёмцеся, калі ласка, са значэннямі сімвалаў, якія найбольш часта сустракаюцца ў варажбе.

БУТЭЛЬКА — вельмі аб'ёмны сімвал. Можа азначаць прыемную гутарку, застолле або сварку, бойку. Гэта не той знак, які можа павесці вас наперад.

ЗОРКА — сімвал нязведанага, далёкага, недаступнага. Гэта можа быць мара, цяжкадасягальная мэта, дзёрзкае рашэнне.

МАЛПА — вы знаходзіцеся ў добрым настроі, правакуеце тых, хто вакол, рабіць нейкія дзеянні.

ПРОФІЛЬ — канкрэтны чалавек, які па нейкіх прычынах займае важнае месца ў вашым жыцці.

СЦЯГ — знак, які кліча наперад, заклік да дзеяння. Нельга спыняцца на палове шляху.

ДРЭВА — сімвал жыцця, росту. Часта з'яўленне гэтага знака сімвалізуе пачатак новага жыцця.

ВОЖЫК — не належыць да ліку эгаістаў, але валодае заганамі, якія ўласцівы скупым людзям.

ДОМ.— сімвал вашага дома. Усё, што вы ўбачыце далей, будзе датычыцца вас і вашых блізкіх.

МЯДЗВЕДЗЬ — вы не ў стане ацаніць абстаноўку належным чынам, таму не прымайце паспешных рашэнняў.

ЗАЯЦ — часцей за ўсё гэта вы самі: дзеянні, звязаныя з ім, адпаведна звязаны і з вамі.

СВЕЧКА — імкненне да мэты, прычым мэта і шлях яе дасягнення не апраўдваюць абраныя сродкі (на малюнку свечка часцей за ўсё патушаная).

ПАРАСЯ — буйная непрыемнасць; вы не з тых людзей, у якіх здараюцца дробныя непрыемнасці.

МАШЫНА — падарожжа, удалая дарога, вясёлая кампанія, сустрэча новых сяброў, застолле.

КАЛЯДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ

Калі ў калядны вечар патрасці яблыні, будзе многа яблыкаў.

* * *

Калі калядная ноч ветраная — чакай галодны год.

* * *

Калі ў калядны вечар у садзе спяваюць і танцуюць — адтуль знікаюць краты.

* * *

Калі на Каляды кот ловіць мух — летам будзе многа конікаў і блых.

* * *

Калі ў калядную раніцу пацерці снегам спіны коням і каровам, летам іх не кусаюць авадні і камары.

* * *

Калі ў калядную ноч снег блішчыць — будзе ўдача з дробнай жывёлай.

* * *

Калі мала снегу ў пачатку зімы — будзе багата на яго ў канцы яе.

ЗВЯРЫНЕЦ

ПЕВЕНЬ ПРАКУКАРЭКАЕ 23 СТУДЗЕНЯ

Па ўсходняму гараскопу год Пеўня бывае няць разоў за шасцідзесяцігоддзе (як і іншыя знакі 12-гадовага жывёльнага календара). Але кожны з няці Пеўняў мае дачыненне да розных прыродных стыхій і мае сваю афарбоўку. Надыходзячы — чорнага колеру, кіруючая стыхія года — вада. Менавіта яна і павінна крыху змякчыць звычайную ваяўнічасць Пеўня. Вада ж дасць яму большую, чым звычайна, інтуітыўнасць.

На Усходзе гэты год заўсёды лічыўся суровым: час Пеўня прымушае ўсіх шмат працаваць, інакш любы можа апынуцца на мяжы банкруцтва або беспрацоўя. Певень забяспечыць парадак і стабільнасць, але намаганні яго будуць ляжаць не зусім у плоскасці нашых дэмакратычных імкненняў. У яго год свет набудзе трываласць — пры некаторай долі фанфаронства. Час, спрыяльны для ваенных. Менавіта ў год Пеўня Гітлер прыйшоў да ўлады, але і разгромлены фашызм быў таксама ў год Пеўня. У гэты год нарадзіліся не толькі такія вядомыя ваяўнічыя асобы, як Рышэлье, Гебельс, Суворaў, Калчак, Конеў, але і паэты, мастакі, мысліцелі: Кіплінг, Фолкнер, Даль, Навоі, Прышвін і інш.

Певень пракукарэкае 23 студзеня, а не 1-га, бо лунны каляндар не супадае з сонечным.

ЗАКЛАДНАЯ

ЖАРТАЧКІ!

Шеф, заложу до вашего сведения.

Вчера я посетил высшее ущербное заведение.

Кафедрами завидуют люди семи пядей на лбу.

В лабораториях много куркуляторов.

За порядком следят караторы групп.

Преподаватели президиумничают.

Возле деканатства висит зеленая тоска объявлений: на ней отличники учебы на фотокарточках в перфокурточках.

Получая стипендию, все студенты ощущают умеренность в завтрашнем дне. Это и есть материальное симулирование.

Столовая оставляет жевать лучшего. В меню имеются: валяная рыба, гангренки, блевштексы и ломтики железобатона.

Зимой в общежитии всегда плясовая температура. У женского общежития стоят мужеловки.

Студентки-дипломницы постигают теорию супругости, распевая песню «Большой декрет для маленькой компании».

Из мужского общежития под руководством стыдсовета вывозят на свалку отполлитрованные столы.

Все студенты посещают консультанцы. Хотя садистжокей обладает стереокомплексом неполноценности. Я сам был на консультанцах, так лампочки там горят вполнахала...

Рокеры и брекисты переведены на хулигальное положение.

Аэробких девушек приглашают мужженственные кавалеры.

Играла срампластинка.

Наутро — новость: институтские бандидаты наук вместе с падшими научными сотрудниками подверглись проверке некстационной комиссии, которую заинтересовал их штиль работы.

В общем, шеф, вуз и ныне там!

МОДА НОВАГА ГОДА

ВАМ — ЗВАННЕ ДОКТАРА НАВУК

Мода — гэта не толькі мастацтва. Значная частка жыцця. Наша ўвасабленне ў ім. А яшчэ...

Мода — самая дэмакратычная навука. Яе вобраз, распрацаваны на наступны сезон, яшчэ раз пацвярджае гэта. Усе асноўныя тэндэнцыі па-ранейшаму застаюцца ўмоўнымі і асацыятыўнымі. І мы, як заўсёды, можам выбіраць асабісты, непаўторны напрамак у велізарнай палітры стыляў, што прапануюць нам мадэльеры ў якасці самых-самых.

На СПАРТЫЎНЫ напрамак робіць уплыў тэма ваенізаванага адзення ў спалучэнні з «вясковай», а таксама тэма паляўнічага касцюма. У маладзёжным ансамблі — спалучэнне элементаў мужчынскага і жаночага касцюма. Перавага аддаецца мяккім і звышмяккім навобмацак тканінам. Цёплая палітра жоўтага, карычневага і зялёнага колераў.

РАМАНТЫЧНЫ напрамак аб'ядноўвае некалькі вобразных груп.

У першай пераклікаюцца па каларыту, сілуэту і настрою вобразы мінулага і сучаснасці. Матавыя паверхні тканін спалучаюцца з бліскучымі, мяккая палітра залацістых адценняў мядовага колеру — з чырвоным, сінім, зялёным.

Другая група быццам выйшла з моднага салона ў старажытнасці. Тканіны цяжкія, атласныя, ажурны трыкатаж. Аздабленні — карункі і вышыўка.

Трэцяя група рамантычнага напрамку адлюстроўвае вельмі актуальную для сённяшняй моды ідэю саборнасці. Формы і прапорцыі адзення, колер павінны адпавядаць абранаму напрамку. Робіць свой уплыў стыль «ад куцюр» 60-х гг. Перавага сухім тканінам. Колеры: зялёны (яблык), жоўты (святлафор), чырвоны, чорны і белы.

Характэрная рыса наступнага напрамку — ПРАВІНЦЫЯЛЬНАГА — вольнасць. Крыніца натхнення — англійскі правінцыяльны стыль, адзенне кансерватыўнае, «крыху паношанае і састарэлае». Ансамбль адзення шматслойны. Матэрыялы практычныя і мяккія. Модныя колеры: высушанай ружы і розныя адценні карычневага.

У аснове ЭЛЕГАНТНАГА напрамку ляжыць стыль высокай моды «ад куцюр», з уплывам поглядаў і плыняў мяжы 60—70 гг. Узор новай элегантнасці дае зліццё рамантызму, багемы са строгасцю інтэлекту. Сінтэз розных культур у далікатным выглядзе, шыкоўныя тканіны ў простым афармленні адпавядаюць артыстычнаму ідэалу гэтага напрамку.

Адыходзіць ад устойлівых канонаў КЛАСІЧНЫ напрамак. Мяняюцца прапорцыі і аб'ёмы адзення, больш мяккай становіцца палітра, больш смелым вобразнае рашэнне.

ЭТНІЧНЫ напрамак характарызуецца больш пашыранам і паглыбленым разуменнем папулярнай раней фальклорнай тэматыкі. Цяпер дызайнераў цікавіць не толькі сялянскі касцюм, але і мастацтва этнаса ў цэлым. Гэты стыль пазбаўлены тэатральнасці і празмернасці. Тут у асноўным выкарыстоўваюцца базавыя мадэлі з дэталямі этнічнага характару.

АВАНГАРДНЫ напрамак цалкам будуецца на новай тэхналогіі. Тканіны адпавядаюць дынамічнаму стылю адзення, часта выкарыстоўваюцца каляровыя блокі. Тканіны вельмі «рухомыя» і эластычныя. Вобраз, які ствараецца, асацыіруецца з хуткасцю, энергіяй.

Калі вы ведаеце свой стыль і ўдакладнілі змяненні ў ім, якія нясе з сабою вобраз моды новага сезона, звярніце ўвагу на некалькі акцэнтаў сённяшняй моды. Яе формы — перш за ўсё прапарцыянальныя, геаметрычныя і пластычныя. Аб'ёмы — маленькія і ўмераныя. Даўжыня — невялікая. Ансамбль — звычайна шматслойны, прычым яго ўнутраныя слаі аздабляюцца больш за знешнія.

Упрыгожванні выбірайце з таго багацця, якое прапануюць сёння дызайнеры. Яны аддаюць перавагу на гэты сезон «высакародным» ланцужкам у стылі «шанель», завушніцам, пацеркам і бранзалетам з буйных рознакаляровых шкляных каменьчыкаў розных геаметрычных формаў. Калі гадзіннік — дык вуглаватай формы. Калі металічны ланцужок — дык з буйных звенняў і з падвеснымі бліскучымі шарыкамі. Калі бранзалеткі — дык вельмі шырокія і масіўныя. Самыя модныя матэрыялы для ўпрыгожванняў — дрэва, скура, спалучэнне камянёў з дрэвам або скурай, слановая косць або косць маманта (ці іх удалая імітацыя). Сярод модных матываў — раслінны і жывёльны свет, аздабленні ў выглядзе нябесных цел матавасрэбнага або малочнага колеру, абрысы дамоў на фоне неба.

У фурнітуры спалучаюцца простая форма і «шыкоўныя» матэрыялы. Пераважае няправільная форма і саматужная апрацоўка.

На жаль, не існуе пакуль звання «доктар модных навук». Але затое вы можаце вырашыць самі, ці здольныя яго насіць.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, г. Загарадны зав., 3.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВІПА імя Я. Коласа.

29 снежня

Зак. 2201.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.